Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРА-МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА І ГІДРАМЕТІНСТЫТУТА

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.
Тэл. 24271 і 23280

№ 13 (126)	11—20 кастрычніка	1933 г.

ЗМЕСТ

СІНОПТЫЧНЫ АГЛЯД

Гэта дэкада характэрна хуткімі зменамі барычных вобласцяй і прахаджэннем розных мас паветра.

У першы дзень дэкады тэрыторыя БССР занята вобласцю высокага ціску з масамі кантынентальнага арктычнага паветра, што выклікае паніжэнне т-ры да — 1°. 12 і 13 кастрычніка БССР занята цыклонам, які прышоў з Ісландыі праз Скандынавію з масамі больш цёплага марского палярнага паветра, што выклікала падвышэнне т-ры, павялічэнне воблачнасці, а таксама ўзмацненне вятроў. Гэтае паветра з часам ператвараецца ў кантынентальна-палярнае паветра з рухам на ўсход.

14 кастрычніка тэрыторыя БССР цалкам занята масамі кантынентальна-палярнага паветра, якое ўтварылася з мас марского палярнага паветра шляхам доўгага знаходжання на кантыненце.

15 і 16 кастрычніка на фронце, які падзяляе масы кантынентальна-палярнага паветра ад мас марскога палярнага паветра, на тэрыторыі БССР утвараецца хваля, якая рухаецца на паўночны захад і выклікае аблажныя ападкі ў гэтыя дні.

17 кастрычніка на тэрыторыю Беларусі пранікае з усходу вобласць высокага ціску з масамі кантынентальна-палярнага паветра, якое характэрызуецца сухім надвор'ем, памяншэннем воблачнасці і падвышэннем т-ры.

18, 19 і 20 вобласць высокага ціску з масамі кантынентальна-палярнага паветра цалкам захапляе БССР і распаўсюджваецца далёка на захад. У гэтыя дні мы наглядаем памяншэнне воблачнасці з яснымі начамі і моцнымі ранішнімі туманамі.

20 кастрычніка наглядаецца далейшае прасоўванне антыцыклона яшчэ больш на захад і тэрыторыя БССР цалкам пападае пад уплыў гэтага высокага ціску. Наогул кажучы, гэта дэкада характэрызуецца хуткімі зменамі барычных абласцяй, некаторым падвышэннем т-ры, памяншэннем воблачнасці і рэдкімі невялікімі даждждамі з пераходам к больш устойліваму надвор'ю ў канцы дэкады.

Л. Харлап.

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА за 11—20 КАСТРЫЧНІКА 1933 г.

Тэмпература паветра на працягу гэтай дэкады трымалася даволі высокая. Асабліва цёплымі былі наступныя дні: 12 і 13, якія па ўсёй БССР мелі сярэднюю т-ру 10—12^0, потым 19 і 20 толькі ў паўднёвай палове БССР т-ра хісталася ад 9 да 12^0. У астатнія дні т-ры размяркоўваліся роўнамерна па ўсёй БССР, падвышаючыся з поўначы на поўдзень і хістаючыся каля 7-8^0. Сярэдняя дэкадная т-ра вышэй нармальнай на 3-4^0 і хістаецца каля 8-9^0. Максімальныя т-ры даходзілі да 15-16^0, мінімальныя т-ры вельмі нізкія, але дадатныя, толькі адна станцыя Дрыса адзначыла замаразак 14-га.

Ападкі выпалі ў наступных колькасцях: на поўнач ад лініі Плешчаніцы—Новае-Каралёва выпала каля 15 мм, на поўдзень-жа значна больш, ад 20 да 40 мм. У Слуцку і Турску адзначана нават больш 40 мм. Гэта ўжо з'яўляецца вельмі вялікай колькасцю.

Адносна размеркавання ападкаў па днях дэкады трэба сказаць наступнае: у паўночнай кліматычнай зоне амаль уся іх колькасць выпала 15-га, астатнія ўсе дні былі без ападкаў. У цэнтральнай кліматычнай зоне значныя ападкі наглядаліся 14, 15 і 16-га, астатнія-ж дні былі або сухія або з нязначнымі ападкамі. У пераходнай і паўднёвай зонах ападкі наглядаліся 13, 14 і 15-га, а астатнія дні ў большасці былі сухія. Найвялікшыя сутачныя колькасці ападкаў наглядаліся 14-га ў апошніх 2-х зонах і даходзілі да 24 мм.

Ветры пераважалі ўсходнія і паўночна-ўсходнія, сярэдняй хуткасці, 4 м/сек. Воблачнасць у сярэднім складала 90% агульнага пакрыцця неба. Працягласць сонечнага ззяння была зусім нязначнай.

Н. Малішэўская.

Табл. вынікаў метэаралаг. назіранняў за 11—20 кастрычніка 1933 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхоўвага пласта глебы (на глыб. 10—15 см.)
I. Паўночны (Вазёрны)	3	Полацак	S	7	S	7	—	8	8	вільготная
	52	Дрыса	E	4	S	12	—	8	8	»
	63	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	»
	65	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	E	4	S	10	9	9	8	мокрая
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—
II. Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	SW	4	SW	7	—	9	8	мокрая
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	102	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	»
	13	Барысаў	NE	4	S	7	—	9	8	»
	16	Менск	S	4	S	7	—	9	8	»
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	NE	7	S	12	—	10	9	мокрая
	25	Асіпавічы	E	4	SW	7	—	10	10	вільготная
	10	Орша	SW	4	SW	7	—	9	8	»
	19	Горкі	E	4	E	7	17	10	9	»
III. Цэнтральны (Раўнінны)	88	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	E	4	NE	7	—	10	9	—
	30	Мар'іна-Сосны	—	—	—	—	—	—	—	—
	21	Магілеў	E	4	S	7	—	9	8	мокрая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	SW	4	SW	7	—	9	8	вільготная
	71	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	»
	31	Турск	E	4	E	7	—	9	8	»
	32	Жлобін	E	11	NE	12	—	9	8	»
IV. Паўднёвы (Нізінны)	33	Жыткавічы	E	4	E	7	—	10	9	вільготная
	37	Калінкавічы	SW	4	E	10	—	9	9	»
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	86	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	»
	38	Гомель	W	4	SE	7	—	10	10	»
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—
	35	Васілевічы	NE	4	SE	10	9	9	9	вільготная
	40	Людвінава	S	4	E	7	—	10	10	вільготная

Табліца вынікаў метэаралагічных на

Кліматычны раён	№№ на карце	Назва станцый	Тэмпературы паветра																Адносная вільготнасць паветра за 13 г. у %%
			11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі наглядаўся мінімум	
(Вазёрны)	3	Полацак	8	11	9	4	6	6	8	8	7	7	—	8	5	13	2	14	75
	52	Дрыса	10	12	9	3	5	7	8	7	7	7	—	6	—	14	—1	14	80
	63	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	65	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	6	12	8	7	6	7	6	6	8	7	—	7	4	13	1	11	81
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
(Вадападзельны)	8	Лепель	4	11	9	7	7	6	6	8	8	8	—	8	—	14	4	15	77
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	102	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	7	11	10	7	7	6	6	8	10	9	—	8	5	15	4	15	78
	16	Менск	8	12	10	8	8	5	7	6	10	9	—	8	5	15	3	18	80
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	8	12	10	8	9	6	8	7	11	9	—	9	5	16	4	18	79
	25	Асіпавічы	7	11	8	9	10	6	8	7	10	10	—	9	6	13	2	18	80
	10	Орша	6	10	10	8	8	6	6	8	9	7	—	9	5	13	4	11	82
	19	Горкі	5	10	10	8	10	7	6	6	10	8	—	8	5	13	1	11	83
(Раўнінны)	88	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	9	12	10	8	9	6	8	7	11	9	—	9	—	12	4	18	87
	30	Мар.-Сосны	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	21	Магілеў	5	10	10	8	9	6	8	6	11	8	—	8	5	14	3	18	84
	13	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	6	11	11	9	10	7	7	6	11	9	—	9	5	15	0	19	80
	71	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	6	11	11	9	10	6	8	7	11	9	—	9	6	15	2	18	81
	32	Жлобін	7	11	11	9	10	7	8	7	11	10	—	9	6	15	3	18	79
(Нізінны)	33	Жыткавічы	9	13	11	9	10	7	7	8	12	10	—	10	6	17	3	17	83
	37	Калінкавічы	7	12	12	10	10	7	6	7	12	10	—	9	6	16	1	18	84
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	86	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	7	11	11	10	11	7	8	7	11	10	—	9	6	15	2	18	80
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	35	Васілевічы	7	11	12	10	10	6	6	6	12	10	—	9	6	15	2	18	81
	40	Людвінава	8	12	12	12	11	7	9	7	11	11	—	10	7	14	—	18	82 1

х назіранняў за 11—20 кастрычніка 1933 г.

…лі нагляд. мінімум	Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %%	Тэмпература паверхні глебы: Максім.	Мінімальн.	Чысло, калі нагл. мінімум	Ападкі ў мм.: 11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сума	Метэаралагічная з'ява (у дужках азначаны числы)
4	75	—	—	—	..	0.4	..	..	13.0	0.3	..	0.1	..	..	—	13.8	туман (14)
4	80	—	—	—	..	1.0	..	..	10.0	1.0	..	1.0	..	..	—	13.0	туман (14)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	..	..	..	..	11.0	..	..	..	..	..	—	11.0	—
1	81	19	—2	18	..	..	..	..	15.0	..	..	..	..	..	—	15.0	туман (12, 13)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
5	77	—	—	—	0.2	..	..	0.3	11.0	1.0	..	2.0	0.1	0.1	—	14.7	туман (12, 13)
—	—	—	—	—	0.2	..	..	2.0	11.0	1.0	..	1.0	..	..	—	15.2	туман (18, 19)
—	—	—	—	—	0.1	0.1	0.1	3 0	12.0	1.0	0.1	0.1	0.1	0.1	—	16.7	—
5	78	—	—	—	0.3	..	2.0	4.0	14.0	0.5	..	..	..	..	—	20.8	—
8	80	18	2	18	0.4	0.4	0.6	7.0	12.0	10.0	..	0.1	0.1	..	—	30.6	туман (11)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
8	79	—	—	—	0.2	..	0.5	12.0	11.0	0.2	..	..	..	..	—	23.9	туман (20)
8	80	—	—	—	..	..	3.0	14.0	15.0	..	..	..	..	..	—	32.0	туман (11)
1	82	—	2	18	..	0.2	..	2.0	17.0	0.3	..	..	0.4	0.1	—	20.0	туман (17)
1	83	20	0	11	..	..	0.5	4.0	16.0	0.1	..	1.0	0.4	..	—	22.0	туман (18)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
8	87	—	—	—	0.1	11.0	1.0	24.0	10.0	0.2	..	..	..	0.1	—	46.4	туман (12, 13, 14, 17)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
8	84	—	—	—	..	..	0.2	10.0	18.0	..	..	..	..	..	—	28.2	туман (12)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
9	80	—	—	—	..	0.3	3.0	11.0	13.0	..	..	..	..	..	—	27.3	туман (13, 18)
—	—	—	—	—	0.2	0.5	3.0	12.0	16.0	0.3	0.2	0.1	0.1	..	—	32.4	туман (12, 17)
8	81	22	1	18	..	..	7.0	22 0	13.0	0.2	..	..	..	..	—	42.2	туман (12, 13)
8	79	—	—	—	..	..	5.0	22.0	6.0	0.1	..	..	0.2	..	—	33.3	туман (8, 18)
7	83	—	—	—	..	..	7.0	23.0	3.0	1.0	..	..	0.1	..	—	34.1	туман (13)
8	84	—	—	—	..	0.4	11.0	21.0	3.0	0.1	..	..	..	0.1	—	35.6	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	..	..	8.0	16.0	12.0	..	..	..	..	0.1	—	36.1	туман (13, 18)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
8	80	—	—	—	..	1.0	3.0	14.0	11.0	..	..	..	..	..	—	29.0	туман (13, 15)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
8	81	—	—	—	..	0.1	11.0	16.0	3.0	..	..	0.1	0.1	..	—	30.3	туман (20), буза (18)
8	82	15?	3	18	..	4.0	4.0	4.0	3.0	0.2	0.1	0.1	0.1	..	—	15.5	туман (13, 18)

Сельска-гаспадарчая гідраметэаралагічная характарыстыка за дэкаду

Увесь ход надвор'я ў гэтую дэкаду з'яўляецца досыць спрыяючым для с.-г. вытворчасці. Сярэдняя т-ра паветра за дэкаду роўная 8^0-9^0 — была вышэй нормы на 3^0-4^0 і давала магчымасць поўнаму развіццю азімых. Жыта і пшаніца па ўсёй тэрыторыі БССР знаходзяцца ў фазе кушчэння. Толькі метстанцыя Васілевічы адзначае поўныя ўсходы азімых (у папярэднюю дэкаду—усходы на 10%).

Колькасьць ападкаў хоць і даволі значная, але яна размеркавалася па дням такім чынам, што толькі 2-3 дні былі са значнымі ападкамі. У астатнія 7-8 дзён ападкаў або зусім не было, або выпала іх зусім нязначная колькасць, таму ў гэтыя дні была поўная магчымасць вытвараць уборку гародніны і бульбы, а таксама ўспашку на зяб.

Адбыўшыйся на метстанцыі Дрыса замаразак пры т-ры — 1^0 не з'яўляецца шкодным для існуючага становішча с.-г. культур.

Папасы знаходзяцца ў здавальняючым стане. Захворванняў заразлівымі хваробамі і падзяжа жывёлы не адзначана.

С. Старобіна.

Метеаралагічная характарыстыка вясны і лета 1933 г.

Пачнем характарыстыку кароткім разглядам умоў папярэдняга перыяду, ліквідацыі зімы.

Снегатаянне пачалося вельмі рана і адбывалася настолькі інтэнсіўна, што асноўныя масы снегу зліквідаваліся ўжо к 3-й дэкадзе сакавіка. Прычынай гэтаму з'явілася вельмі значнае павышэнне т-ры, якое было з пачатку 2-й дэкады сакавіка. Але ў 2-й палове сакавіка і да апошняй дэкады красавіка не наглядалася паступовага падвышэння т-ры, а наадварот, сярэднія сутачныя т-ры некалькі разоў значна зніжаюцца і пераходзяць праз 0^0, напрыклад, 21—24 сакавіка і 7-8 красавіка. На працягу ўсяго гэтага перыяда, да апошняй дэкады красавіка, наглядаецца выпадзенне снегу і нават кароткачасовае ўтварэнне снегавога насцілу, напрыклад, каля 15—19 красавіка.

Толькі ў 3-й дэкадзе красавіка, 21—27 ліку, устанаўліваецца сярэдняя сутачная т-ра $+5^0$, або пачынаецца вясна. Такі пачатак трэба лічыць на $1^1/_2$—2 тыдні пазней нармальнага для БССР. Позняя вясна з'явілася разам з тым і вельмі халоднай. З табліцы № 1 бачым, што сярэднія месячныя т-ры красавіка

Табл. № 1

Сярэдняя месячная т-ра паветра і адхіленне яе ад нармальнай (гр. 2)

Станцыі	Красавік		Май		Чэрвень		Ліпень		Жнівень	
	1	2	1	2	1	2	1	2	1	2
Новае-Каралёва	2.3	—1.7	9.8	—1.9	14.3	—1.4	18.5	+1.2	14.0	—1.3
Горкі . . .	3.0	—1.6	10.2	—2.3	13.9	—2.8	18.8	+0.8	14.4	—1.8
Менск . . .	3.0	—2.4	11.1	—1.4	14.3	—2.3	18.5	+0.5	14.5	—1.7
Турск . . .	3.6	—1.9	11.5	—1.9	14.3	—3.2	19.1	+0.2	15.1	—2.0
Жыткавічы . .	3.7	—3.2	12.4	—1.8	14.7	—3.1	19.2	0.0	15.4	—2.0
Васілевічы . .	3.8	—2.9	12.4	—1.6	14.7	—2.9	19.6	+0.4	15.5	—1.7

ніжэй нармальных. Гэта паніжэнне супроць нармальных т-р хістаецца ад 1°,6 на паўночным усходзе да 3°,2 на паўднёвым захадзе. Сярэдняя т-ра мая месяца таксама ніжэй нармальнай, некалькі менш чым на 2°. Асабліва халоднымі былі перыяды ў пачатку мая з 2-га па 6-ае, калі сярэдняя сутачная т-ра апускалася да 4-5°, а мінімальная ніжэй 0°, потым 23—26 мая сярэдняя сутачная т-ра апускалася да 7-8°, а мінімальная да 2—4°. Нават у пачатку чэрвеня, з 3 да 6, сярэдняя сутачная т-ра апускалася да 4° па ўсёй БССР, а мінімальная да 1-2°.

Прыблізна 8-ае чэрвеня трэба лічыць ужо канцом вясны.

Замаразкі, не гледзячы на значныя пахаладанні, скончыліся ў гэту вясну нармальна, г. зн. у 1-ай дэкадзе мая. Наогул у маі наглядалася 2-3 выпадкі замаразкаў.

Што датычыцца рэжыму ападкаў на працягу вясны, то згодна табл. 2 маем, што ў красавіку ў паўночнай частцы БССР выпала значна больш нармальных колькасцяй, на астатняй-жа тэрыторыі блізка да нармальнай з адхіленнямі ў абодва бакі, прычым значная частка іх прыходзілася якраз на канец красавіка. Май месяц паўсюды даў надзвычайна вялікія колькасці ападкаў, перавышаючыя нармальныя мясцамі на 100% і нават больш, за выключэннем некаторых адзінкавых выпадкаў.

Табл. № 2

Месячныя сумы ападкаў
(1—у 1933 г., 2—нармальныя)

Станцыі	Красавік		Май		Чэрвень		Ліпень		Жнівень	
	1	2	1	2	1	2	1	2	1	2
Полацк . . .	47	26	133	49	94	81	88	71	97	79
Новае-Каралёва	68	38	90	55	124	78	112	94	166	91
Орша	57	48	79	60	117	68	112	89	167	77
Горкі	23	41	75	50	153	74	72	84	156	82
Менск	37	44	95	56	143	85	86	87	146	80
Магілеў . . .	46	42	48	57	120	80	44	83	152	79
Чэрыкаў . . .	41	37	116	48	—	75	140	98	104	64
Васілевічы . .	49	51	56	60	148	78	90	99	110	70

Асабліва значныя ападкі наглядаліся ў такія дні: у маі—1, 8, 9, з 11 па 14, 25, 26 і 31, у пачатку чэрвеня вельмі значныя ападкі былі толькі ў паўднёвай палове БССР. Параўнаўча сухія перыяды былі з 3 па 7 мая, потым з 15 па 21.

Пераход ад вясны да лета, як ужо гаварылася вышэй, адбыўся, прыблізна, 8 чэрвеня і працягвалася лета да пачатку верасня. Разгледзім тэмпературныя ўмовы на працягу яго. Чэрвень меў сярэднія т-ры ніжэй нармальных. Але гэта паніжэнне ідзе за лік 1-ай дэкады. З другой-жа дэкады т-ры яго хістаюцца каля нармальных.

Ліпень з'явіўся выключэннем, бо ён адзін з астатніх вясновых і летніх месяцаў меў сярэднія т-ры некалькі, на 0,5—1°, перавышаючыя нармальныя. Асабліва высокія т-ры наглядаліся ў другой і часткова 3-й дэкадах. Сярэднія сутачныя т-ры перавышалі 20°, а максімальныя дасягалі ў паўночнай палове БССР 28-29°, а на поўдні нават 31-32°.

Жнівень зноў меў сярэднія т-ры ніжэй нармальных на 1-2°, прычым 1-я дэкада яшчэ больш цёплая, а потым пачынаецца хуткае пахаладанне.

Пачатак верасня, прыблізна 5-ае чысло, трэба лічыць канцом лета, таму мы скончым характарыстыку жніўнем месяцам.

Выпадзенне ападкаў у летнія месяцы было наступным: у чэрвені (гл. табл. № 2) выпалі надзвычайна вялікія колькасці, у межах ад 100 да 150 мм, тады як нармальна для чэрвеня выпадзенне 70—80 мм. У ліпені колькасці ападкаў былі вельмі блізкімі да нармальных, г. зн. да 80—100 мм. У жніўні зноў вельмі вялікія колькасці, значна перавышаючыя нармальныя. Асабліва вільготнымі днямі былі наступныя: у чэрвені ў цэнтральнай частцы БССР 12-ае і 13-ае, потым па ўсёй БССР 17-ае, 19-ае і 20-ае, далей з 21-га па 25 амаль кожны дзень. З 27-га наглядалася параўнаўча сухое надвор'е. З пачатку ліпеня наглядаліся вельмі значныя ападкі ліўневага характара. З 9-га да 12-га параўнаўча сухое надвор'е. 13-га па ўсёй БССР выпалі значныя ападкі. У астатнія дні 2-й дэкады ападкі наглядаюцца пераважна ў паўночнай і цэнтральнай кліматычных зонах, у пераходнай-жа і асабліва ў паўднёвай ападкаў выпала мала. 3-я дэкада пераважна сухая за выключэннем 25-га, калі на поўдні выпалі значныя ападкі навальнічнага характара, і апошніх 2 дзён, калі ападкі ў вялікіх колькасцях наглядаліся па ўсёй тэрыторыі. Наогул трэба сказаць, што калі ападкі чэрвеня і пачатку ліпеня мелі характар зацяжных дажджоў, то ў 2-й і 3-й дэкадах ліпеня яны былі галоўным чынам ліўнявога характару і кароткачасовыя.

У жніўні ападкі маюць зацяжны характар і размяркоўваюцца вельмі роўнамерна на працягу месяца, хаця часам і наглядаліся вельмі сухія ясныя дні.

Выпадзення граду амаль не наглядалася на працягу ўсяго лета, толькі некаторыя станцыі зарэгістравалі адзінкавыя выпадкі.

Неабходна прывесці яшчэ некаторыя дадзеныя адносна працягласці сонечнага ззяння.

Наступная табліца дае абсалютную інсаляцыю, г. зн. фактычна наглядаўшуюся ў гадзінах, і адносную—стасунак абсалютнай да магчымай у %%.

Станцыі	Красавік		Май		Чэрвень		Ліпень		Жнівень	
	гадз.	%%	гадз.	%%	гадз.	%%	гадз.	%%	гадз.	%%
Новае-Каралёва	79	19	157	31	152	29	249	48	152	33
Асінторф . . .	—	—	—	—	166	32	255	52	174	38
Горкі	—	—	—	—	—	—	—	—	130	27
Заазер'е . . .	—	—	107	22	148	29	263	53	150	33
Турск	85	21	232	47	166	33	278	55	141	31
Васілевічы . .	91	22	236	49	176	35	281	55	175	39

Сярэдняя для БССР адносная інсаляцыя роўна прыблізна ў красавіку 45%, у маі, чэрвені і ліпені—55% і ў жніўні—65%. У параўнанні з гэтымі лічбамі маем у красавіку надзвычайна малую інсаляцыю (у сярэднім 20%), у маі толькі на поўдні

БССР інсаляцыя блізка да нармальнай, каля 50%, у цэнтральнай-жа частцы і на поўначы вельмі малая. У чэрвені па ўсёй тэрыторыі БССР інсаляцыя хістаецца каля 30% і такім чынам значна менш нармальнай. У ліпені інсаляцыю трэба лічыць нармальнай, 50—55%. У жніўні зноў інсаляцыя рэзка змяняецца і хістаецца ад 30 да 40%, што значна менш нармальнай.

Як бачым, гэтыя даныя добра ўзгадняюцца з ужо сказаным адносна колькасці і размеркавання ападкаў: робяць больш поўным агульны малюнак надвор'я.

Н. Малішэўская

Ход конкурса на лепшую метстанцыю

Па дадзеным на 1-Х-33 г. кожная метстанцыя набрала наступны процант балаў:

1.	Асіповічы	43 %	16.	Магілеў	59 %
2.	Бабічы	51 „	17.	Мар'іна-Сосны	37 „
3.	Барысаў	53 „	18.	Мар'іна-Горка	54 „
4.	Бычыха	51 „	19.	Менск	79 „
5.	Васілевічы	55 „	20.	Негарэлае	60 „
6.	Віцебск	81 „	21.	Нова-Каралёва	70 „
7.	Орша	51 „	22.	Полацак	73 „
8.	Гомель	69 „	23.	Сіроціна	85 „
9.	Горкі	80 „	24.	Слуцак	45 „
10.	Дрыса	54 „	25.	Стара-Барысаў	67 „
11.	Жыткавічы	61 „	26.	Турск	72 „
12.	Калінкавічы	76 „	27.	Чэрыкаў	53 „
13.	Крычаў	54 „	28.	Зазер'е	50 „
14.	Лепель	56 „	29.	Асінторф	55 „
15.	Людвінава	63 „		Сярэд. па БССР	59 %

Конкурснай камісіяй заносяцца кандыдатамі на чырвоную дошку наступныя метстанцыі:

1. Віцебск, загадчык — т. Фільрозэ
2. Горкі, загадчык — т. Васільчанка
3. Менск, загадчык — т. Бардзілоўскі
4. Калінкавічы, загадчык — т. Булаўко

На чорную дошку заносяцца Мар'іна-Сосны і Слуцак. Дадаткова заносяцца—Асіпавічы.

1. Мар'іна-Сосны, загадчык т. Насановіч Я.
2. Слуцак „ т. Сяргейчык
3. Асіповічы „ т. Дубовік

Як бачым, за верасень месяц маецца значны зрух у працы метсеткі: падвысіўся сярэдні % па БССР; даволі вялікая колькасць станцый падвысіла свой % балаў, у выніку чаго дадаткова занесены кандыдатамі на чырвоную дошку м. с. Горкі і Менск; зняты з чорнай дошкі м. с. Лепель, Бабічы, Крычаў, Сіроціна, Васілевічы, Барысаў, Зазер'е. Але некаторыя станцыі знізілі свой % балаў — Асіпавічы, Орша, Дрыса, Калінкавічы, М. Горка, Асінторф.

Метстанцыі ўсё яшчэ слаба ўдзельнічаюць у мясцовым друку. Толькі адна метстанцыя Стара-Барысаў — заг. т. Байгодзін, змясціла ў газэце „Бальшавік Барысаўшчыны" спецыяльны артыкул — „Метэаралогія на службу ўраджаю".

Належыць таксама адзначыць надзвычайна карысную працу, якую праводзіць загадчык метстанцыі Горкі т. Васільчанка ў прадраканні надвор'я па мясцовых прыметах. Прагнозы гэтыя перадаваліся акаляючым соўгасам і калгасам. Процант апраўдваемасці прагнозаў (ападкі, воблачнасць) даволі вялік — каля 90. За верасень і кастрычнік гэты процант дасягнуў 92.

Конкурс заканчваецца. Калектывам усіх метстанцый належыць не застанаўлівацца ў падвышэнні якасці сваёй працы і па сканчэнні конкурса. Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на штодзеннае падвышэнне сваёй кваліфікацыі, на лепшы ўдзел у грамадскай працы, на падвышэнне працдысцыпліны, чоткасці, аперацыйнасці ўсёй працы метстанцыі, на больш цесную сувязь з мясцовымі арганізацыямі і прадпрыемствамі і асабліва з сельскай гаспадаркай. У апошнім па метсетцы справа стаіць не на належнай вышыні.

Старшыня Конкурснай
Камісіі *Кучынскі.*

ПАСТАНОВА

Па Галоўнаму Кіраўніцтву Адзінай Гідраметслужбы БССР

ад 24/X-33 г.

§ 1.

Выкананне гадовага плана за тры кварталы па Гімеіну паказвае, што маецца вялікая пагроза яго зрыва па паасобным відам работ:

а) Тэматычны план выканан толькі на 60,1 проц.

б) План першапачатковай апрацоўкі гідралагічных назіранняў выканан на 70 проц. і метэаралагічных — на 65,5 проц.

в) Па палявым гідралагічным работам маецца таксама значны прарыў: па Паўднёва-Беларускай Гідралагічнай станцыі план за тры кварталы выканан на 54 проц., па Мазырскай на 61 проц. і па Менскаму гідраметрычнаму раёну на 70 проц.

Гэта сведчыць аб тым, што дырэкцыя не зрабіла належных вывадаў па прапановам Камісіі па чыстцы ячэйкі КП(б)Б Гідраметінстытута, не перабудавала свае працы, не мабілізавала грамадскасці на выкананне і перавыкананне планавых заданняў, у выніку чаго мы і маем ганебны прарыў.

§ 2.

Прапанаваць Дырэктару Гімеіна т. К а н а в а л а в у абгаварыць выкананне плана за тры кварталы і план на апошні квартал на сходах супрацаўнікоў аддзелаў і сектараў Інстытута, распрацаваўшы шэраг канкрэтных мерапрыемстваў па забяспечанню выканання гадавога плана поўнасцю і не менш 50 проц. плана IV квартала к 5/XI-33 г.

§ 3.

Для ліквідацыі прарыва ў выкананні тэматычнага плана прапанаваць т. К а н а в а л а в у перанесці адпачынкі на 1934 г. альбо вырашыць пытанне аб іх кампенсацыі наступным навуковым работнікам: Л і ў ш ы ц у, Д а н о в і ч і Л і с і ц к а м у.

§ 4.

Для забеспячэння выканання тэмы па аналізу ф-ы Ішкоўскага аслабаніць т. Л і ў ш ы ц а ад кіраўніцтва палявымі гідралагічнымі работамі, усклаўшы гэту працу часова на спецыяліста па абслугоўванню народнай гаспадаркі ў галіне гідралогіі т. Н о в ы ш а.

§ 5.

Пытанне наконт заг. Маз. станцыі П а л о н с к а г а вырашыць па прыездзе Дырэктара Гімеіна, які лічна абследуе работу станцыі.

Нач. ГК АГМС БССР *Мамаеў.*

ХРОНІКА

10—14 кастрычніка ў Маскве пры Цэнтральным Кіраўніцтве АГМС СССР адбылася куставая транспартная нарада па гідраметэаралагічнаму абслугованню асення-зімовых перавозак. Ад Гал. Кіраўніцтва АГМС БССР на нарадзе прысутнічаў і рабіў даклад т. Кузьмін—спецыяліст па абслугоўванню народнай гаспадаркі ў галіне метеаралогіі.

21—24 кастрычніка пры Дырэкцыі Заходніх чыгунак адбылася нарада па гідраметэаралагічнаму абслугоўванню Заходняй чыгункі ў зімовы перыяд. Ад ГК АГМС БССР на нарадзе прысутнічаў т. Кузьмін.

Белдзяржвыдавецтва заключыла з Заг. аддзелу Метэаралогіі Гімеіна т. Кучынскім умову на перавыданне яго брошуры „Прымаразкі і барацьба з імі".

Галоўнае Кіраўніцтва 25-XI бягучага году мяркуе склікаць першую Ўсебеларускую нараду загадчыкаў метеаралагічных і гідралагічных станцый БССР з наступнай абвесткай дня:

1. Даклад Нач. Цэнтральнага Кіраўніцтва АГМС СССР т. Вангенгейма аб задачах АГМС па абслугоўванню народнай гаспадаркі і абароны краіны.

2. Даклад Нач. Гал. Кіраўніцтва АГМС БССР аб выніках рэарганізацыі АГМС БССР і вынікі работ за 1933 год, а таксама садаклад т. Кузьміна аб рабоце секцыі.

3. Даклады з месц трох заг. гідраметстанцый.

4. Інфармацыя Нам. Дырэктара Гімеіна т. Лейвікава аб рабоце Гідралагічнай Канферэнцыі Прыбалтыцкіх краін.

——

Работы па методыцы скарыстання энергіі сонца для тэхнічных і бытавых патрэб, якія вытвараліся К. Г. Трафімавым у Ташкенце ў 1932 г., далі шмат новага, так пабудаваны: сонечны кіпяцільнік, які дае 100 літраў кіпятку ў дзень, плошча кіпяцільніка ўсяго 1,3 кв. метра. Сонечная баня, у якой могуць за дзень памыцца 40 асоб. Даследчы сонечны паравы кацёл. Сонечны апрасніцель.

Адказны рэдактар П. Мамаеў.
Тэхнічны рэдактар Ю. Дудкін.
Члены рэдкалегіі А. Кайгарадаў, П. Бутаеў.

Друкарня Беларускай Акадэміі Навук. Нямігa, 7.

Галоўлітбел № 1508. Заказ № 4598. Тыр. 1000 экз.